УДК 811.161.3’42

# ГУТАРКОВЫЯ СІНТАКСІЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ Ў П’ЕСАХ АНДРЭЯ МАКАЁНКА

**Шубадзёрава Ала Міхайлаўна**
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

**Новікава Алена Сяргееўна**
студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”
(г. Магілёў, Беларусь)

*Ключавыя словы: гутарковая сінтаксічная канструкцыя, слабааформленая сінтаксічная канструкцыя, эліпсіс, няпоўныя кантэкстуальн-сітуацыйныя сказы, парцэляцыя.*

*Аб’ектам навуковага аналізу сталі гутарковыя сінтаксічныя канструкцыі ў творах вядомага беларускага драматурга А. Макаёнка. Да ліку такіх адзінак былі аднесены няпоўныя кантэкстуальныя і сітауцыйныя сказы, а таксама парцэляваныя канструкцыі.*

Гутарковае маўленне разглядаецца ў розных стылях беларускай літаратурнай мовы, асабліва мастацкім, які часта выкарыстоўваецца як крыніца для вывучэння гутарковага стылю беларускай літаратурнай мовы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Не выключэннем з’яўляецца і мова драматургічных твораў А. Макаёнка, у якой шырока ўжываюцца гутарковыя сінтаксічныя канструкцыі.

Прыкмета такіх канструкцый – іх слабая структурная афармленасць. Слабаафармленыя сінтаксічныя адзінкі не выяўляюць ні спецыфічных канструкцыйных прыкмет, ні ўласцівасцей нарматыўнасці і ўзнаўляльнасці ў маўленні. Яны ўзнікаюць у маўленчай плыні, калі персанаж, спрабуючы выказаць думку, адмаўляецца ад працягу распачатай фразы або перабудоўвае канструкцыю на хаду. Нейкая частка лексічнага матэрыялу пры гэтым застаецца па-за выказваннем, словы асацыяцыйна нанізваюцца адно на аднаго адпаведна змене ўяўленняў. Напрыклад: [Хлопец:] ***Бацька, што я папрашу...*** [Максім:] ***Ну...*** [Хлопец:] *Панаглядай за фермай. Там сёння Ракета ацялілася. Двойню прывяла. Калі што, дык пазавеш мяне.* [Максім:] ***Бач ты. Двухступеньчатая значыць. Ракета?*** *Каля чыёй жа хаты цябе шукаць.* [Хлопец:] ***Каля… буду недалёка ад сваёй…*** (А. Макаёнак. Лявоніха на арбіце.) Выдзеленыя рэплікі прыведзенага дыялагічнага адзінства не маюць выразна акрэсленай будовы. Для іх уласціва сэнсавая незавершанасць, якая перадаецца ў пісьмовым тэксце шматкроп’ем, а ў вусным маўленні пры дапамозе паўзы. Сэнс такіх сказаў можна зразумець толькі з кантэксту.

Незавершаныя слабаафармленыя канструкцыі ў п’есах А. Макаёнка арганізуюцца па-рознаму. Яны могуць быць вымаўлены ў хуткім тэмпе, спантанна, звычайна іх сэнс цалкам не ясны без звароту да канкрэтнай прадметнай сітуацыі, у якой яны былі ўжыты: [Сырадоеў:] *Дзе калабок? Дзе староста?* [Надзея:] ***Я зараз… Я знайду… Я сама…*** (А. Макаёнак. Трыбунал.) Выкарыстанне аднатыпных незавершаных двукампанентавых канструкцый тыпу ***Я зараз… Я знайду… Я сама…*** абумоўлена ўсхваляванасцю дзейнай асобы ў момант напружанай нервовай сітуацыі, імкненнем хутка пабудаваць наступную рэпліку па той самай сінтаксічнай мадэлі, што і папярэдняя, няздольнасцю выказаць свае думкі ў больш складанай форме пад уплывам эмоцый.

Слабаафармленыя адзінкі могуць выразна паказваць разрыў сінтаксічных сувязей сказа і словазлучэння, але разам з тым маюць падабенства з тыпізаванымі канструкцыямі і ў такім выпадку ўяўляць з сябе пабудовы пераходнага тыпу, якія служаць вусна-маўленчай базай адпаведнай мадэлі. Як памылковыя гэтыя сінтаксічныя адзінкі звычайна не ўспрымаюцца, магчыма, таму, што абрывы ўласцівы і літаратурнай мове. Напрыклад: [Дачка:] *Тата, ён нічога не разумее! Праўда?* [Тата:] ***Ён злы і таму…*** [Дзед:] *Тэк-тэк-тэк... не разумее?* [Сын:] *Так – я злы! Без праўды людзі робяцца злыя!* ***Нават добрыя людзі! Нават дзеці!*** *Запомніце!* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У мове драматургічных твораў А. Макаёнка даволі шырока прадстаўлены слабааформленыя гутарковыя канструкцыі з незамешчанымі сінтаксічнымі пазіцыямі, адсутнасць якіх кампенсуецца сродкамі мікра- і макракантэксту, а таксама сітуацыяй выказвання. Асабліва часта ў п’есах выкарыстоўваюцца няпоўныя простыя сказы з кантэкстуальным пропускам сінтаксічных пазіцый дзейніка і выказніка: [Тата:] *Крывавая* ***бітва*** *з Мухамедам была?* [Сын:] ***Была.*** *Ён яе і пачаў.* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.) У другой рэпліцы прапушчаны дзейнік “бітва”, які ўзнаўляецца з папярэдняга кантэксту. Або: [Мама:] *Не. Гэтак* ***жыць*** *далей нельга.* [Тата:] ***Вядома, нельга.*** (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.) У другім сказе адсутнічае выказальнае слова “жыць” састаўнога дзеяслоўнага выказніка. Радзей, але таксама сустракаюцца сказы з пропускам дапаўненняў: [Дачка:] ***Сумненні? Не-е-е. Не ведала.*** (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.) У апошнім сказе персанаж не ўжывае слова “сумненняў”, якому ўласціва сінтаксічная функцыя дапаўнення. Каб пазбегнуць таўталогіі і дасягнуць моўнай эканоміі, драматург выкарыстоўвае такія сінтаксічныя канструкцыі, у якіх адсутнічае частка складанага сказа: [Сын:] ***Ты нешта хацела сказаць?*** [Дачка:] ***Што тата пайшоў…*** (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.) У рэпліцы дзейнай асобы прапушчана галоўная частка складаназалежнага сказа “я хацела сказаць”.

Да ліку слабааформленых сінтаксічных адзінак неабходна аднесці парцэляваныя канструкцыі. Пры парцэляцыі адбываецца падзел сказа, пры якім змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў дзвюх ці некалькіх інтанацыйна-сэнсавых адзінках маўлення, размешчаных адна за другой пасля раздзяляльнай паўзы”: [Цярэшка:] ***Дык ён жа яшчэ малады. Падлетак. Дурны яшчэ. А падрасце – дык чаго ж? Гады праз тры, калі што, дык чаго ж. Сам прывяду на службу.*** *Арол будзе!* (А. Макаёнак. Трыбунал.) Рэпліка персанажа ўяўляе з сябе адну парцэляваную канструкцыю, якая складаецца з асноўнай (базавай) часткі *Дык ён жа яшчэ малады* і пяці парцэляваных *Падлетак. Дурны яшчэ. А падрасце – дык чаго ж? Гады праз тры, калі што, дык чаго ж. Сам прывяду на службу.* Дадзены стылістычны прыём перадае перарывістасць маўлення дзейнай асобы, падкрэслівае важнасць аддзеленых частак выказвання і разам з тым выступае як сродак характарыстыкі персанажа – Цярэшкі Калабка, які павінен пераканаць нямецкага каменданта ў праўдзівасці яго слоў і ў тым, што ён з’яўляецца фашысцкім прыслугачом і верна служыць ворагам.

У драматургічных творах І. Шамякіна ў пераважнай большасці выпадкаў парцэляцыя адбываецца ў межах простага сказа: [Тата:] *Як вуха? Адарвалі вуха?* [Дачка:] *Ну, так. Зусім. У руках нясе.* ***Мухамед нагой наступіў. І адарваў.*** (Паказвае.) *Хр-р-р-рась!..* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.) Высокую ступень парцэляванасці ў простым сказе маюць наступныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

канструкцыі: а) аднародныя выказнікі (у сувязі з тым, што кожны аддзелены элемент валодае прэдыкатыўнасцю): [Цярэшка:] *Ну, ну...* ***ну развяжы!.. Выпусці!..*** ***Ну, пашкадуй!*** (А. Макаёнак. Трыбунал.); б) удакладняльныя і аднародныя акалічнасці: [Дачка:]*Во смеху будзе!* [Сын:] ***Ненадоўга! На час візіту.*** *А там...* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал.); в) аднародныя дапаўненні: [Паліна:]. *Дык ета ім я буду яечню смажыць?* [Цярэшка:]. ***Ім… і мне..*** (А. Макаёнак. Трыбунал.).

Такім чынам, Андрэй Макаёнак як адзін з вядомых беларускіх драматургаў шырока выкарыстоўвае ў сваіх творах уласцівыя гутарковаму маўленню слабааформленыя сінтаксічныя адзінкі, якія ствараюць эфект гутарковасці, надаюць мастацкаму тэксту натуральнасць і дынамізм, жывасць і праўдзівасць. Акрамя таго, у беларускай драматургіі яны выступаюць адначасова і дзейсным мастацка-выяўленчым сродкам.

**Літаратура**

1. Макаёнак, А. Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Андрэй Макаёнак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 1 : П’есы. – 381 с.
2. Макаёнак, А. Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Андрэй Макаёнак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 2. : П’есы; сцэны сельскага жыцця; аднаактоўкі; гумарэскі; фельетоны; артыкулы. – 376 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова